# МАСТАЦТВА

УДК 929:78.071.1(476+438) Манюшка С.

*Да 195-годдзя з дня нараджэння Станіслава Манюшкі*

*П. Р. ІГНАТОВІЧ*

## ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ І ТВОРЧАСЦЬ СТАНІСЛАВА МАНЮШКІ

*У 60-я гг. XX ст. аўтар прапанаванага артыкула працаваў загадчыкам аддзела культуры Чэрвеньскага раёна і меў непасрэднае дачыненне да вывучэння і папулярызацыі творчай спадчыны і ўшанавання памяці выдатнага кампазітара Станіслава Манюшкі (1819–1872), асобе якога і прысвечана дадзеная праца.*

5 мая 2014 г. музычная грамадскасць Беларусі, Польшчы, Літвы, Расіі і іншых краін святкуе сто дзевяноста пятую гадавіну нараджэння знакамітага кампазітара, стваральніка нацыянальнай оперы Станіслава Манюшкі.



Доўгі час на радзіме мала што ведалі аб творчасці выбітнага кампазітара, але пачынаючы з 60-х гг. мінулага стагоддзя цікавасць да С. Манюшкі не толькі праявілася ў поўнай меры, але і прынесла значны плён у вывучэнні і папулярызацыі асобы і творчай спадчыны славутага беларуса.

У 1965 г. Міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч звярнуў увагу тагачаснага старшыні Чэрвеньскага райвыканкама Г. А. Шчамялёва на тое, што беларускія дзеячы культуры – і музыканты, і навукоўцы амаль нічога не ведаюць пра асобу С. Манюшкі, у прыватнасці пра месца яго нараджэння, у той час як іх польскія калегі праяўляюць значную цікавасць да ўшанавання памяці славутага кампазітара і таму звярнуліся ў Міністэрства культуры з прапановай устанавіць памятны знак на яго радзіме.

Г. А. Шчамялёў распарадзіўся распачаць пошукавую работу, у якой самы непасрэдны ўдзел прымаў аўтар артыкула. Было вызначана месца нараджэння кампазітара. Мясцовыя старажылы мала што памяталі з расказаў сваіх бацькоў, прадстаўнікоў старэйшых пакаленняў. Высвятлілася, што ад колішняй сядзібы Убель нічога не захавалася. Бадай адзінай сведкай засталася старая таполя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праз некаторы час у раён прыехалі намеснік Міністра культуры Р. Мачулін, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ С. Марцэлеў і кампазітар Г. Вагнер. Была распрацавана праграма, якая прадугледжвала канкрэтныя крокі па ўвекавечванні памяці кампазітара, вызначаны тэрмін і выканаўцы (службы раёна, перш за ўсе аддзел культуры і Міністэрства культуры). Пачалася карпатлівая работа па выкананні намечанага.

У выніку, летам 1966 г. на месцы былога маёнтка, што ў кіламетры ад цэнтральнай сядзібы рыбакамбіната (зараз пасёлак Азёрны) на маляўнічым беразе рэчкі Волмы, дзе нарадзіўся і правёў свае дзіцячыя гады С. Манюшка, быў устаноўлены памятны абеліск, на якім на беларускай і польскай мовах выгравіравана: «Тут, у фальварку Убель, 5 мая 1819 года нарадзіўся вялікі польскі кампазітар Station Манюшка» і нотны запіс некалькіх тактаў арыі Ёнтэка з оперы «Галька».



Народны артыст СССР Р. Р. Шырма і загадчык аддзела культуры Чэрвеньскага раёна П. Р. Ігнатовіч ускладваюць кветкі да помніка С. Манюшкі (1969)

Да 150-годдзя з дня нараджэння С. Манюшкі адкрыўся музей. На адкрыццё музея прыехалі Ю. М. Міхневіч, выдатныя дзеячы беларускай культуры, народныя артысты СССР Р. Р. Шырма, Г. І. Цітовіч, кіраўнікі раённых і абласных арганізацый. Удзельнічала польская дэлегацыя на чале са старшынёй Саюза кампазітараў Польшчы доктарам Стэфанам Сляdзінскім. У складзе дэлегацыі быў і польскі музыказнаўца М. Фукс, які прыклаў шмат намаганняў, каб захаваць памяць аб кампазітары.

Праграма мерапрыемстваў, акрамя афіцыйных, уключала канцэрт, якім пачаўся фестываль музыкі Станіслава Манюшкі, што працягваўся з 4 па 12 мая 1969 г. па ўсёй рэспубліцы. Тады ж упершыню была выканана балада «Убельскія таполі» Г. Вагнера, прысвечаная С. Манюшку [1, с. 40–41].

Навуковае даследаванне творчай спадчыны С. Манюшкі звязана перш за ўсё з імем буйнога беларускага даследчыка А. І. Мальдзіса, які ў 1969 г. у кнізе «Падарожжа ў XIX стагоддзе» змясціў вялікі артыкул, прысвечаны творчасці кампазітара, і раскрыў асабістыя тэхналогіі пошуку неабходнай інфармацыі [2]. З больш позніх работ адзначым кнігу У. Мархеля «Прысутнасць былога» [3], працы В. Скорабагатава «Зайгралі спадчынныя куранты» [6] і «Пра опернае мастацтва Станіслава Манюшкі» [7], сумесныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікацыі У. Мархеля і В. Скарабагатава ў зборніку «Славутыя імёны Бацькаўшчыны» [4], асобныя публікацыі А. Л. Капілава, А. І. Ахвердавай, І. В. Серады і іншых беларускіх аўтараў, цікавы архіўны матэрыял, змешчаны ў кнізе Язэпа Янушкевіча «За архіўным парогам» [11, с. 114–124], у 2010 г. у Санкт-Пецярбургу выдадзена кніга «Партрэты польскіх музыкантаў: нарысы па гісторыі польскай музычнай культуры» [8].

Род Манюшкаў, што з даўніх пор перасяліўся на тэрыторыю Міншчыны, паходзіць з этнічных беларускіх тэрыторый Падляшша (рэгіён Беластока). Многія знакамітыя прадстаўнікі даволі разгалінаванага роду зрабілі значны ўклад у культурнае жыццё беларускіх зямель. Дзед кампазітара, таксама Станіслаў, меў вялікую сям'ю – шэсць сыноў і чатыры дачкі, займаў пасаду ваеннага суддзі ў Вялікім Княстве Літоўскім і пакінуў сваім сынам значную спадчыну: Манюшкі валодалі маёнткамі ў Мінскай губерні, у тым ліку ў Смілавічах, Радкаўшчыне, Убелі на Ігуменшчыне. Усе сыны, выхаванцы Віленскага ўніверсітэта, былі высокаадукаванымі, дэмакратычна настроенымі людзьмі. Наогул, з гэтай сям'і выйшлі многія вучоныя-асветнікі.

Бацька кампазітара Чэслаў Манюшка быў даволі здольным мастаком і паэтам, добра ведаў народную культуру, фальклор.

Маці, Альжбета Маджарская, з роду заснавальнікаў Слуцкай радзівілаўскай мануфактуры, дзе выраблялiся знакамітыя паясы, вызначалася музыкальнымі здольнасцямі і схільнасцю да мастацтваў. Альжбета атрымала добрую музычную адукацыю пад кіраўніцтвам вядомага мінскага музыканта і кампазітара Пётры Карафы-Корбута і стала першай настаўніцай сына: вучыла не толькі іграць на інструментах, але і спасцігаць душу музычнага твора і найперш – народнай песні. У 1856 г. С. Манюшка пісаў Адаму Кіркору: «Першай школай разумення музыкі для мяне былі "Гістарычныя песні" Нямцэвіча, якія выконваліся дзіўным голасам маёй маці. Гэтыя сур'ёзныя мелодыі, даступныя зусім не адразу, былі маёй штодзённай музыкальнай ежай, і пяцігадовым дзіцем... я ўсе іх у дасканаласці пеў» [8, с. 62].



Двор Манюшкаў на малюнку Н. Орды



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станіслаў выхоўваўся ў атмасферы старасвецкай сядзібы, дзе гучала польская і беларуская музыка. Абавязковым атрыбутам быту былі музычна-літаратурныя, а часта і тэатральныя вечары, якія ўносілі разнастайнасць і расквечвалі культурнае жыццё ўсёй акругі.

Хлопчык быў адзіным дзіцем ў сям'і і вызначаўся слабым здароўем (ад нараджэння кульгаў і быў блізарукім), сціпласцю і сур'ёзнасцю, неўласцівай дзецям, цікавасцю да чытання і музыкі.

Існуе легенда, што вясной 1819 г. у дом Манюшкаў у маёнтку Убель уляцела ластаўка і пачала ляпіць над калыскай маленькага Стася гняздо. Гэты выпадак Манюшкі ўспрынялі як шчаслівае прадвесце і чуйна адносіліся да схільнасцей сына. З цягам часу апавяданне пра ластаўчына гняздо пераўтварылася ў сямейнае паданне, якое ўмацоўвала веру Станіслава ва ўласнае кампазітарскае прызначэнне, падтрымлівала ўпэўненасць у творчых пачынаннях. «Убельская ластаўка» стала сімвалам і назвай абласнога свята беларуска-польскай музыкі, якое перыядычна праводзіцца на радзіме кампазітара.

Дзяцінства будучага кампазітара прайшло на ўлонні беларускай прыроды, сярод сялян. Вечарамі хлопчык хадзіў у вёску і прагна слухаў песні, якія спявалі, вяртаючыся з поля, дзяўчаты. Гэтыя мелодыі, вядома, адрозніваліся ад тых, што іграла на фартэпіяна маці. Былі прасцей і будзённей. Але хлопчыка вабіла іх своеасаблівая гармонія, сардэчнасць. Стась хутка запамінаў сялянскія песні, яны сталі тым зернем, з якога пазней вырасла «Галька» [2, с. 114–115].

Радасць ахоплівала хлопчыка, калі бацькі, едучы на некалькі дзён у Смілавічы, у госці да дзядзькі, у палац, які раней належыў Міхалу Агінскаму, бралі яго з сабой. Хлопчыка асабліва вабіў старадаўні гадзіннік. Казалі, што гэты гадзіннік, заведзены невядомай рукой, у поўнач адзвоньвае дзівосную мелодыю. Стасю вельмі хацелася пачуць яе. Аднойчы, калі ўсе заснулі, ён устаў з ложка, крадком прабраўся да гадзінніка і сціх у чаканні. І раптам Стасю здалося, што пакой напаўняецца таямнічымі гукамі. У начной цішы чуўся сярэбраны бой. Аднекуль разам з месячным святлом плыў казачны перазвон курантаў. Той самы перазвон, які многа гадоў пазней загучаў у паланэзе трэцяга акта оперы «Страшны двор» [2, с. 115–116].

Адукацыю С. Манюшка атрымаў у Варшаве (1827–1830) і ў Мінску (1830–1834). Вучыўся ў школе піяраў, дзе вялікая ўвага надавалася вывучэнню прыродазнаўчых навук і розных моў. Урокі музыкі яму даваў вядомы арганіст пратэстанцкай царквы Аўгуст Фрэер, ігрой якога захапляўся М. Глінка. У гэты час у Варшаве ззяў геній юнага Шапэна. Манюшкі жылі недалёка ад Шапэнаў і наведвалі адны і тыя ж музычныя дамы.

У верасні 1830 г. Манюшкі пераехалі ў Мінск, дзе Станіслаў вучыўся ў Мінскай гімназіі – асяродку перадавой грамадска-дэмакратычнай думкі. У гэтых сценах спасцігалі веды многія знакамітыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Сёння на мемарыяльнай дошцы будынка, што знаходзіцца па адрасе плошча Свабоды, 23, пералічаны дванаццаць прозвішчаў, сярод якіх імя Станіслава Манюшкі.

Горад у XIX ст. уяўляў сабой значны культурны цэнтр. Па ўспамінах аднаго з французскіх салдат – удзельнікаў вайны 1812 г., Мінск «быў лепшым пасля Вільні горадам у беларуска-літоўскім краі; сярод жыхароў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было шмат інтэлігентных сем’яў, што аднолькава свабодна размаўлялі як па-французску, так і па-нямецку» [10, с. 103].

У 1836 г. Станіслаў наведаўся ў Вільню. Тут ён упершыню пачуў оперу ў выкананні прафесійных артыстаў трупы Шмідткомпфа – «Чарадзейны стралок» К. Вэбера. Многія вечары Манюшка праводзіў у тэатры, адкрываў для сябе новы свет opернай музыкі. Ён вырашыў, што абавязкова стане кампазітарам.

У Вільні да Станіслава прыходзіць першае і адзінае на ўсё жыццё каханне. Аляксандра была дачкой палкоўніка Мюлера, у якога здымаў кватэру С. Манюшка. Маці давала згоду на шлюб дачкі толькі ў тым выпадку, калі юнак атрымае спецыяльную прафесійную адукацыю і зможа матэрыяльна ўтрымліваць сям’ю [5, с. 111]. Чэслаў Манюшка марыў, каб сын паступіў на дзяржаўную службу, але ў Стася, які па хваробе не скончыў гімназію, не засталося ніякіх шансаў на паспяховую кар’еру, ды і ахвоты да яе не было. Сям’я Манюшкаў вырашыла адправіць сына вучыцца музыцы ў Берлін, які славіўся ў той час не толькі сваімі інстытутамі, але і традыцыямі музычнага рамантызму.

«У сямнаццаць гадоў, яшчэ да ад’езду на вучобу ў Нямеччыну, Манюшка ўпісаў у альбом Аляксандры Мюлер, будучай жонкі, некалькі сваіх песень-прызнанняў у каханні. У часе ж вучобы ў рэктара Берлінскай пеўчай акадэміі Рунгенхагена ён выдаў тры песні на словы Адама Міцкевіча з іх перакладамі на нямецкую мову. Ад стрыманай звычайна крытыкі, якая адзначыла смеласць і асаблівую прывабнасць гэтых песень, зыходзіць не ардынарная пахвальба авансам, а прызнанне таленту кампазітара – прызнанне, заўважым, у краіне, дзе ўжо ведалі тонкую песенна-рамансавую культуру Ф. Шуберта і пачыналі знаёміцца з псіхалагічна дакладнымі лірычнымі песнямі Р. Шумана. Гэта абнадзейвала і абавязвала, хоць, можа болей дакладна, дысцыплінавала ў працы – навучальнай і творчай», – адзначае У. Мархель [3, с. 181–182]. Паўсюднае гучанне ў Германіі даступных, інтанацыйна непасрэдных песень Шуберта, Шумана, Мендэльсона падводзіла маладога Манюшку да думкі аб напісанні ўласных песенных твораў дзеля іх шырокага выканання дома.

У 1840 г. малады кампазітар вярнуўся з Германіі, дзе паспяхова скончыў навучанне і атрымаў неабходны вопыт для далейшай музычнай дзейнасці. У жніўні гэтага ж года быў заключаны доўгачаканы шлюб з Аляксандрай Мюлер.

С. Манюшка вярнуўся ў Беларусь з думкай стварыць песні ў народным духу і з надзеяй, што тэкстаў для гэтага на радзіме ён знойдзе колькі трэба. Кампазітар змясціў у «Tygodniku Petersburskim» праект свайго зборніка, якому даў змястоўную і шматзначную назву – «Хатні спеўнік». «З таго часу, – пісаў ён у “праекце”, – як у цывілізаванай Еўропе пачалі з вышэйшага пункту гледжання ставіцца да музыкі і ацэньваць яе не толькі як мову, што перадае пэўную думку і пачуцце... але яшчэ як выяву пэўнай мясцовасці, нацыянальнага характару народаў... самыя выдатныя мастакі пачалі выяўляць і распрацоўваць гэтае радовішча невычэрпнай гармоніі... Не прэтэндуючы на вышэйшы ў музыцы талент, але заахвочаны ласкавым, а можа, вельмі паблажлівым успрыманнем, якое мае першыя апубліка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваныя музычныя спробы змаглі выклікаць, я асмельваюся, наколькі мне дазваляе мой талент, пашырыць рэпертуар краёвых песень...» [4, с. 236].

Паступова ўзнік план заваяваць музычны свет рускай сталіцы, і ў жніўні 1842 г. С. Манюшка ўпершыню прыехаў у Пецярбург. Аднак з працаўладкаваннем справа не задалася. У пісьме жонцы ён пісаў: «калі б я толькі змог знайсці якую-небудзь пасаду, якая дасць мне заробак, то не пагрэбаваў бы ніякай» [8, с. 64]. Прыйшлося вярнуцца ў Вільню. У тым жа годзе С. Манюшка атрымаў сціплую пасаду арганіста ў касцёле Святога Яна ў Вільні.

Першы «Хатні спеўнік» выйшаў з друку ў канцы 1843 г. Усяго за віленскі перыяд былі апублікаваны чатыры выпускі. Даследчыкі творчасці кампазітара падкрэсліваюць, што ўжо першыя песні азнаменавалі новы этап у развіцці вакальнай творчасці і адрозніваліся нацыянальнай самабытнасцю і арыгінальнасцю творчага почырку. У дванаццаць сшыткаў, шэсць з якіх былі выдадзены пры жыцці (астатнія пасля смерці кампазітара апублікаваў яго сябра Ян Карловіч), увайшло больш трохсот песень самых розных вакальных форм – ад жанравай замалёўкі да балады. Аўтарамі тэкстаў да песень былі А. Міцкевіч, Я. Чачот, У. Сыракомля і інш.

Любімым паэтам С. Манюшкі з'яўляўся Адам Міцкевіч. Кампазітар напісаў больш за 30 твораў да тэкстаў А. Міцкевіча. У. Мархель і В. Скарабагатаў прыводзяць звесткі аб тым, што паэт быў знаёмы з творамі С. Манюшкі і з задавальненнем слухаў яго кампазіцыі [4, с. 238].

Асабліва блізкімі былі адносіны паміж С. Манюшкам і В. Дуніным-Марцінкевічам. Вынікам сяброўства з'явіліся чатыры камічныя оперы – «Чарадзейная вада», «Рэкруцкі набор», «Спаборніцтва музыкантаў» і «Сялянка» («Ідылія»), у якой, дарэчы, сяляне размаўлялі па-беларуску, а паны па-польску, што не толькі адлюстроўвала рэаліі 40-х гг. XIX ст., але і, безумоўна, паўплывала на працэс уваходжання беларускай мовы і музычнай культуры ў мастацкае асяроддзе.

С. Манюшка падтрымліваў сувязі з многімі беларускімі музыкантамі і паэтамі, пісаў пра іх, садзейнічаў выданню іх твораў, дапамагаў атрымліваць музычную адукацыю, наладжваў канцэрты.

У 1846 г. у сувязі з пастаноўкай аперэты «Латарэя», напісанай на лібрэта А. Мілеўскага, С. Манюшка наведаў Варшаву. Тут ён пазнаёміўся з маладым паэтам У. Вольскім, аўтарам паэмы «Галька». У. Вольскі цудоўна адчуваў сцэну і пасля дамоўленасці з С. Манюшкам хутка перапрацаваў паэму ў лібрэта, якое Манюшка ў кастрычніку 1846 г. прывёз у Вільню. Опера была напісана на працягу 1847 г. і прызначалася для пастаноўкі ў Варшаве, аднак лёс распарадзіўся інакш. Прэм'ера оперы адбылася ў Вільні і была прыязна сустрэта грамадскасцю. У Варшаве опера была пастаўлена толькі праз дзесяць гадоў, калі С. Манюшка ўжо быў сталым, аўтарытэтным і паважаным кампазітарам.

Пасля поспеху «Галькі» ў Вільні С. Манюшка піша кантаты, песні, аркестравыя творы. Яго па-ранейшаму турбуе праблема заробку, звязаная з павелічэннем сям'і, таму кампазітар у 1849 г. прадпрымае новую паездку ў Пецярбург. Аўтарскія канцэрты прайшлі з вялікім поспехам. Гучалі лепшыя творы С. Манюшкі – фрагменты оперы «Галька», кантата «Мільда», сімфанічная ўверцюра «Казка».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць С. Манюшкі заўсёды знаходзіла гарачы водгук у рускіх музыкантаў. М. Глінка, А. Даргамыжскі, Ц. Кюі, А. Сяроў высока ацэньвалі талент кампазітара. Дарэчы, у свой час Ц. Кюі вучыўся ў С. Манюшкі ў Вільні і пад яго кіраўніцтвам напісаў свае першыя творы.

Прэм’ера оперы «Галька» на варшаўскай сцэне кардынальна змяніла жыццёвы шлях кампазітара. З’явіліся захопленыя водгукі не толькі ў польскай, але і ў замежнай прэсе. А канцэрт-бенефіс, які прайшоў следам, прынёс нечаканы па тых часах даход – пяць тысяч рублёў. Ініцыятарам канцэрта была вучаніца Шапэна, жонка куратара варшаўскіх тэатраў Марыя Калергіс. Яна ж садзейнічала атрыманню Манюшкам пасады дырыжора Варшаўскай оперы. У канцы 1858 г. кампазітар з сям’ёй пераехаў у Варшаву і пасяліўся ў Кракаўскім прадмесці. Пераезд стаў для Манюшкі вялікай удачай: ён нарэшце заняў месца, дзе яго талент мог праявіцца ў поўнай меры. А. Мальдзіс так апісвае гэтыя падзеі: «Урэшце настала выпеставаная ў марах часіна. У першы вечар новага 1858 года варшаўскі оперны тэатр быў перапоўнены. Заняты ўсе крэслы ў партэры, трашчыць галёрка. Публіку прываблівала польскае імя на афішах. Не французскае, не італьянскае, а польскае – “Галька”. Пасля ўверцюры загрымелі апладысменты. Усе зразумелі: нараджаецца свая, нацыянальная опера. Яна ўжо існуе, жыве. Яна адпавядае таму нацыянальна-патрыятычнаму ўздыму, які панаваў у Польшчы напярэдадні паўстання 1863 года... Назаўтра “Гальку” паўтарылі. А там пайшоў трэці, пяты, дваццаты спектакль. Каля 1860 года оперу паставілі ў Гродне. Пра Манюшку загаварылі. Стаўшы дырэктарам Вялікага тэатра ў Варшаве, кампазітар пісаў адну оперу за другой – “Плытагона”, “Графіню”, “Вербум набіле”, стварыў на тэкст міцкевічаўскіх “Дзядоў” кантату “Прывіды”, прасякнутую духам беларускай народнай музыкі. І ўрэшце 28 верасня 1865 года ў сценах Вялікага тэатра ўпершыню прагучаў “Страшны двор” – вяршыня опернай творчасці Манюшкі» [2, с. 121].

У 1868 г. «Галька» з поспехам ішла ў Празе (дырыжор Б. Сметана), праз год адбылася прэм’ера ў Маскве, а ў 1870 г. – у Пецярбургу. У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь «Галька» была ўпершыню пастаўлена ў 1975 г. Опера стала сусветна вядомым творам: ставілася ў 25 краінах свету.

Адзначым бясспрэчны ўплыў твораў С. Манюшкі на грамадскасць. Так, прэм’ера оперы «Страшны двор» пераўтварылася ў патрыятычную маніфестацыю. Царскія ўлады забаранілі манюшкаўскі шэдэўр пасля шостага паказу [4, с. 250]. Да 1877 г. «Страшны двор» не з’яўляўся на сцэне, і С. Манюшка яго ўжо не пачуў. Як сцвярджаюць У. Мархель і В. Скарабагатаў, у гэтым творы праявіўся ліцвінскі (беларускі) патрыятызм кампазітара.

Прататыпам «Страшнага двара» для С. Манюшкі паслужыў смілавіцкі замак. Яшчэ ў дзяцінстве, наведваючы родных у Смілавічах, ён пачуў паданне пра старадаўнія куранты замка. Стагоддзі ніхто не заводзіў той гадзіннік, але час па часе ён пачынаў іграць сам. Увасабленнем таго, з дзяцінства запалага ў душу падання, сталі ў оперы арыі Сталубы і Стэфана [6, с. 93].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікавы, вельмі насычаны жыццёвы шлях С. Манюшкі можна падзяліць на некалькі перыядаў. З дня нараджэння і да 8-гадовага ўзросту – убельскі перыяд. Затым 1827–1830 гг. – варшаўскі; з 1830 па 1837 – мінскі; 1837–1840 – берлінскі. У сталым узросце з 1840 г. 18 гадоў – віленскі, а з 1858 і да апошніх дзён – варшаўскі перыяд. Але, як слушна заўважае М. Фукс, дзе б ні быў, дзе б ні жыў кампазітар – у Мінску ці Вільні, Берліне ці Варшаве, ён заўсёды наведваў родныя мясціны [9].

За сваё нядоўгае жыццё (кампазітар пражыў толькі 53 гады) С. Манюшка стварыў вялікую колькасць твораў: 7 опер, 5 аперэт, 3 балеты, 7 мес, славутую канцэртную ўверцюру «Казка», 300 песень, безліч інструментальных і вакальных твораў. Яшчэ пры жыцці ён быў прызнаны нацыянальным геніем. Творчасцю С. Манюшкі захапляліся В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, Янка Купала, У. Караткевіч і іншыя дзеячы беларускай культуры [7, с. 43]. Сёння немагчыма ўявіць сабе гісторыю музычнага тэатра Беларусі без постаці выдатнага кампазітара.

Беларускі мелас знайшоў яскравае ўвасабленне ў музыцы С. Манюшкі. Вытокі яго музыкальнай мовы – у беларускім і польскім фальклоры. Многія з арыгінальных мелодый кампазітара лічацца народнымі.

Безумоўна, адбітак геніяльнасці даследчыкі заўважаюць і ў чалавечых якасцях С. Манюшкі, і ў цудоўнай творчасці. Нездарма з такой пашанай да яго адносяцца і на радзіме – у Беларусі, і ў Польшчы, якой кампазітар прысвяціў значную частку жыцця, творчасці і дзе закончыў свой зямны шлях.

У Мінску да 200-годдзя з дня нараджэння Станіслава Манюшкі на плошчы Свабоды плануецца ўстанавіць помнік.

---

1. *Ігнатовіч, П. Р.* «Яму мінская зямелька родненькая матка...» / П. Р. Ігнатовіч // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1974. – № 1 (17). – С. 38–41.

2. *Мальдзіс, А. І.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры / А. І. Мальдзіс. – Мінск : Нар. асвета, 1969. – 208 с.

3. *Мархель, У.* Прысутнасць былога: нарысы, артыкулы, эсэ / У. Мархель ; пад рэд. В. А. Каваленкі. – Мінск : Выд. М. М. Трафімчук, 1997. – 192 с.

4. *Мархель, У.* Станіслаў Манюшка (1819–1872) / У. Мархель, В. Скорабагатаў // Славутыя імёны Бацькаўшчыны : зб. ; уклад. У. Гілеп [і інш.] ; рэдкал.: А. Грыцкевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БФК, 2003. – 384 с.

5. *Серада, І. В.* Станіслаў Манюшка / І. В. Серада / Памяць : гіст.-дакументальная хроніка Чэрвеньскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – С. 110–113.

6. *Скорабагатаў, В.* Зайгралі спадчынныя куранты : цыкл нарысаў з гісторыі прафесійнай музычнай культуры Беларусі / В. Скорабагатаў. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 154 с.

7. *Скорабагатаў, В.* Пра опернае мастацтва Станіслава Манюшкі... і не толькі / В. Скорабагатаў // Партэр. – 2013. – № 01 (26). – С. 40–43.

8. *Собакина, О. В.* Станислав Монюшко / О. В. Собакина // Портреты польских музыкантов : очерки по истории польской музыкальной культуры / О. В. Собакина. – СПб. : Алетейя, 2010. – С. 61–68.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Фукс, М.* У Убелі над Волмаю / М. Фукс // Панорама. – 1972. – № 4. – С. 12.
10. *Шасцілоўская, К.* Роля Станіслава Манюшкі ў канцэртным жыцці культурных цэнтраў Беларусі ў 40–50-я гг. XIX ст. / К. Шасцілоўская // Роднае слова. – 2009. – № 5. – С. 103–105.
11. *Янушкевіч, Я.* Аўтографы Станіслава Манюшкі / Я. Янушкевіч // За архіўным парогам : Беларуская літаратура XIX–XX стст. у святле архіўных пошукаў / Я. Янушкевіч. – Мінск : Мастац. літ., 2002. – 381 с.

*P. IGNATOVICH*

**LIFE AND CREATIVE WORK OF STANISLAW MONIUSZKO**

*In 60-ies of the XX century the author of the given article was a head of the culture department of the Cherven district and was directly related to the study and popularization of the heritage and commemoration of the outstanding composer Stanislaw Moniuszko (1819–1872), an outstanding personality of whom this work is dedicated to.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 20.02.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ